ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● ● NO.31 (3439) ● ● ЧАЦВЕР, 20 ЖНІЎНЯ, 2015

ШТОТЫДНЁВІК "ГОЛАС РАДЗІМЫ" МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: WWW.GOLAS.BY



**З юбілеем, Ваўкавыск!** Супляменнікі з Тальяцi з музычнымі падарункамі прыехалі на свята ў горад, з якім сябруюць Стар. 2



**А шчасце так блізка...** У латышскім горадзе Дагда прайшоў міжнародны фестываль беларускай песні і танца "ФЭСТ" Стар. 2



**Калейдаскоп майстэрства** Незвычайныя па ў Клубе гістарычнай рэканструкцыі "Люцэрн" вывучаюць па старажытных фрэсках Стар. 4

ІМІДЖ КРАІНЫ

# Сувенір на ўспамін

## Што арыгінальнае могуць набыць у Беларусі турысты з замежжа



Алена Спірыдонава

Выязджаючы за мяжу, мы часта хочам набыць там нешта "на ўспамін". Але які сувенір выбраць: каб і падабаўся, і быў арыгінальным, адлюстроўваў культуру народа? Пытанне актуальнае ў любую пару года. І таму давайце прыгледзімся да сувеніраў беларускіх.

Леташні чэмпіянат свету па хакеі актывізаваў цікавасць да Беларусі: каля 29 тысяч балельшчыкаў з 50 краін наведалі краіну ў той час. Мяркуючы па іх водгуках, культурны імідж у нас быў на вышыні: выдатная арганізацыя спаборніцтваў і сэрвіс, добразычлівасць і гасціннасць гаспадароў. І амаль кожны з іх ставіў сабе пытанне пра сувеніры. Як не памыліцца ў іх плыні і набыць самы "каларытны" беларускі сувенір? Пра тое мы гаворым з мастацтвазнаўцам Аленай Спірыдонавай: яна асабіста знаёма з многімі народнымі майстрамі, кіруе вытворчым прадпрыемствам "Славутасць".

**— Алена Аляксандраўна, мы ведаем: сувенір — гэта нейкі падарунак, які нагадвае пра штосьці прыемнае: пра сябра, сустрэчу, падарожжа... І беларускі сувенір павінен выклікаць згадкі пра нашу гісторыю, традыцыі, культуру. Можа гэта вырабы з лёну, саломкі, шкатулкі? Але ж падобнае сустрэнеш, напрыклад, у Расіі, Літве, Польшчы. А ў некаторых краінах ёсць адметныя сувеніры: з Нідэрландаў прывозяць драўляныя чаравікі-клюмпы, з Францыі — нешта з выявай Эйфелевай вежы, з Расіі часцей — матрошкі... А ці ёсць такі сувенір, які сімвалізуе Беларусь?**

— У нас няма пакуль такіх вядомых брэндаў, накшталт матрошкі ў Расіі. Можа, слуцкія паясы маглі б такой адметнасцю стаць? Але ж толькі цяпер мы пачынаем іх адраджаць. І хачу заўважыць: словы "саломка" і "лён" пазначаюць матэрыял — не прадмет. А сувенір з іх атрымліваецца сапраўдным, нацыянальным, калі ў яго ўкладзена душа майстра, а пры яго вырабе выкарыстаны народныя традыцыі. І ў першую чаргу важныя ўзоры, арнаменты, колер і тэхніка выканання. Сапраўдны беларускі сувенір — гэта каштоўны сплаў традыцый і творчасці. Помню, 25 гадоў таму ладзілася першая выстава нашага аб'яднання майстроў "Славутасць", і прысвечана яна была падзеям Чарнобыля. Прыехалі нашы спонсары з-за мяжы — і былі вельмі здзіўлены выстаўленымі прадметамі. Быццам той жа матэрыял, але колькі адрозненняў у колеры, форме, падачы, фактуры, ідэях... У Расіі прыкладное мастацтва заўсёды было вельмі "ярморочным": яркім, зробленым на продаж. Яно прыцягвае ўвагу і адлюстроўвае характар народа. А ў нашым прыкладным мастацтве няма такой яркасці, "жесткости", няма і выразных ліній. Наша творчасць — гэта больш для сябе, для дамашняга ўжытку. Адсюль і лірычнасць, і нейкая размытасць, і выяўленне беларускай памяркоўнасці. Можа, менавіта тады нашы замежныя госці ўпершыню прызналі: мы — не Расія, мы іншыя, і тое бачна нават па ўзорах народнага прыкладнога мастацтва. → Стар. 4



Гэта зроблена майстрамі з Беларусі

ВЕСТКІ

## Падкова — на шчасце

Марыя Ластачкіна

**Незвычайны сімвал абласнога фэсту-кірмашу працаўнікоў вёскі "Дажынкі-2015" з'явіцца ў горадзе Круглае, што на Магілёўшчыне**

Хоць на палях Беларусі, у яе аграгаспадарках яшчэ шмат працы, аднак і пра свята Дажынкі хлебаробы дбаюць. Рыхтуецца прыняць абласны фэст-кірмаш і горад Круглае. Сімвалам яго стане Падкова шчасця.

Цяпер над творам працуе магілёўскі скульптар Андрэй Вараб'ёў. Па яго словах, Падкову вышынёй 2,2 метра ўсталююць у цэнтры ўрачыстасцяў: паміж раённым Домам культуры і паркам. Майстар упэўнены: ягоная праца, выкананая з бронзы, стане добрым падарункам для жыхароў райцэнтра і абавязкова прынясе ўдачу.

Па задуме аўтара, Падкова шчасця будзе з дзвюх палавінак. На адной скульптар выявіць "смачны" нацюрморт: там і яечня на патэльні, і рыбы, і каўбасы, а яшчэ агуркі, яблыкі, грыбы, малака... На другой — сельскія пейзажы, з абрысамі славутасцяў Кругляншчыны. Завяршаюць задуму каласы і палявыя кветкі. Скульптар закончыў працу над эскізам: спатрэбілася больш за 120 кг пластыліну. Амаль гатовая і скульптура, якая, напэўна, стане адной са славутасцяў Круглага. Андрэй Вараб'ёў лічыць, што вялікая Падкова шчасця будзе не толькі напамінам пра "Дажынкі-2015", але і месцам паломніцтва маладых, якія будуць чэрпаць пры ёй энергію любові і дабрыні.

ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ

# Аб чым маўчаць камяні

**У архівах знойдзены цікавыя факты пра тое, што можа яднаць невялічкую вёску Патапавічы на Ляхавіччыне і сталіцу Аўстрыі Вену**

Здагадкі пра тое, што такая гістарычная повязь існуе, ёсць у нататках археолагаў і гісторыкаў ужо некалькі дзесяцігоддзяў, калі гаворка ідзе пра знакамітыя "Патапавіцкія валуны". Так называецца, нагадаю, група з сямі валуноў, аздобленых нейкімі лічбамі ды таямнічымі знакамі. Валуны можна пабачыць пад драўляным крыжам наўзбоч гасцінца з акна аўто ці аўтобуса ў Патапавічах — злева, калі ехаць з Ляхавіч да Клецка. Цяпер многія падзяляюць думку вядомага археолага, ужо нябожчыка Міхася Чарняўскага, якую замацаваў фактамі гісторык У. Емяльянчык: маўляў, камяні гэтыя ёсць "сібалічныя магілы рыцараў-ліцьвінаў з харугвы Міхала Казіміра Рэйтана", якія пад началам караля Рэспублікі Двух Народаў (Рэчы Паспалітай) загінулі пад Венай 12 верасня 1683 года. Гэта, дарэчы, знакаміты дзень у гісторыі. Ён вядомы сакрушальнай перамогай, якую нанеслі аб'яднаныя еўрапейскія харугвы хрысціян мусульманскім войскам Асманскай імперыі — імі кіраваў Вялікі візір Кара-Мустафа.

Аднак, на нашу думку, гэта не ўсё, што здольныя распавесці маўклівыя валуны з Патапавіч...

На двух камянях пры ўездзе ў вёску з боку Ляхавіч сапраўды чытаецца дата "1683": яна і натхніла гісторыкаў на думкі пра Венскую бітву. Ёсць на некаторых з валуноў езуіцкая абрэвіятура "IHS" (З намі Бог!). Яшчэ на адным накрэслена слова "MARIA": відаць, маецца на ўвазе хрысціянская Дзева Марыя, Маці Божая. На адным з камянёў — выява 8-канцовага крыжа. Па ўсім відаць, гэта не выпадковае спалучэнне слоў ды сімвалаў, і група можа прадстаўляць сабою сапраўдны старажытны мемарыяльны комплекс ваярам той векапомнай ваеннай кампаніі. Над гэтай "сукупнасцю" фактаў варта паразважаць і даследчыкам, і чыноўнікам ад культуры: пара б і даследаваць унікальны мемарыял ды паставіць побач нейкую ахоўна-інфармацыйную шыльду. Нічога ж падобнага ў Беларусі нідзе больш няма! Мы ж пойдзем далей.

Для пошукаў ісціны ёсць такая перашкод: няма Патапавіч ва ўсеагульным Вялікалітоўскім "падымным попісе" 1690 года. Пры тым у ім згадваюцца вакольныя тапонімы: Ляхавічы, Канюхі, Ліхасельцы, Русінавічы ды Грушаўка — радзіма нацыянальнага героя Тадэвуша Рэйтана. Праўда, у 1690-м належала вёска яшчэ іншым асобам, таму вышэйшая згадка пра магілы вояў-гусараў з харугвы Рэйтана можа і памылковая. Што да Патапавічаў, то ў XVIII стагоддзі яны ўжо вядомыя, і жывуць у іх носьбіты "тыпова беларускіх" прозвішчаў Венцэль і Вінэль. Але чаму ўсё ж менавіта там ушанавалі герояў Айчыны, што гінулі за супольную, агульнаеўрапейскую справу?

→ Стар. 3



Знакі на адным з валуноў

РАЗАМ

# З юбілеем, Ваўкавыск!

## Прадстаўнікі тальяцінскай суполкі “Нёман” прыехалі да сваіх сяброў з музычнымі падарункамі

Яшчэ ў лютым суполка “Нёман” атрымала запрашэнне ад партнёраў і сяброў прыехаць на святкаванне юбілею горада. Вырашылі: у Ваўкавыск едзем з ансамблем беларускай песні “Купалінка”, паднавіўшы яго склад, з новым рэпертуарам. У паездку я запрасіла і даўніх сяброў — харэаграфічны ансамбль народнага танца “Лицей” з Ліцэя мастацтваў. Хацелася пазнаёміць навучэнцаў з Беларуссю, а жыхарам горада-юбіляра ў чарговы раз прывезці музычна-спеўна-харэаграфічныя падарункі. Рэпетыцыі праходзілі штодня: вакал, харэаграфія, сцэнічная мова.

Наш творчы дэсант праводзілі ў дарогу бацькі і сваякі. У Маскве сустракаў супрацоўнік Пасольства Юры Сухахосік — з аўтобусам: нас перавезлі з Казанскага на Беларускі вакзал. Дзякуй! Яшчэ ноч у дарозе — і станцыя Масты Гродзенскай вобласці. Сустракала Святлана Вараніца з Таццянай Сяргеевай ды шафёр Аркадзь. Дзякуючы Святлане Уладзіміраўне ў 2010-м пачалося наша сяброўства з Ваўкавыскам і раёнам. Цяпер яна працуе ў Гродне, але ж сябруем!



Госці з Тальяці з поспехам выступалі і ў аграгарадку Вярэйкі Ваўкавыскага раёна

Першы прыпынак — у мемарыяльным комплексе вёскі Шавулічы: у вайну карнікі спалілі яе разам з жыхарамі. Як і Хатынь, месца трагедыі далёка ад населеных пунктаў, але там чыста, дагледжана. Зрубы хат, звон, вельмі шмат жывых кветак. Беларусы заўсёды памятаюць жахі вайны, цану Перамогі — і гэта бачна.

У Ваўкавыску для нас усё падрыхтавалі: утульнае жыллё, смачнае харчаванне, транспарт. Прыемна! 18 ліпеня — сустрэча прадстаўнікоў дэлегацый з Расіі, Літвы, Польшчы, Беларусі са старшынёй райвыканкама. Міхаіл Сіцько ветліва сустракае гасцей. Я трэці раз у горадзе, зачытала Прывітальны адрас кіраўніку горада ад мэра Тальяці, спікера тальяцінскай Думы. Міхаіл Міхайлавіч удзячны за віншаванні, увагу. Абмяняліся сувенірамі. Хвалюючы момант гісторыі фіксуе на фота, відэа Віталь Шылкін, мой унук.

Свята пачалося з мітынгу, ён прысвячаўся 71-й гадавіне вызвалення Ваўкавыскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Потым — шэсце па вуліцах горада. Ішлі з намі і вайскоўцы, і аркестр, і кіраўніцтва раёна, дэлегацыі гарадоў-партнёраў… На плошчы Леніна — прадукцыя, тавары мясцовых вытворцаў. Багатая экспазіцыя! Жыхароў і гасцей горада парадавалі выступамі Хор імя Цітовіча, хор святароў Гродзенскай епархіі, выступалі і гурты з Тальяці. На новай вялікай сцэне! І нашы гурты былі на вышыні. Позна ўвечары — музычны фэст EDM Explosion, лазернае фаер-шоу. Феерверк!

Начальнік аддзела па культуры ды ідэалогіі Дзмітры Зязюля расказаў: горад рыхтаваўся да свята. Напярэдадні ў Ваўкавыску перад райвыканкамам усталявалі знак у гонар атрымання горадам Магдэбургскага права. Вялікі валун, на ім выбіты гістарычны герб горада ў выглядзе галавы ваўка. У скверы воінаў-інтэрнацыяналістаў адкрыты манумент: даніна павагі мужнасці ўдзельнікаў баявых падзей і лакальных войнаў ХХ стагоддзя.

На наступны дзень паехалі выступаць у аграгарадок Вярэйкі: запрасілі мясцовыя жыхары. Гурт “Купалінка” і раней бываў там. Мясцовы Дом культуры не пазнаць: выдатны рамонт, глядзельная зала, бібліятэка, зала для рэгістрацыі маладых і нованароджаных. Пляцоўка вакол ДК — у розных колерах. Душа радуецца! Значыць, ёсць гаспадары, ёсць прыбыткі, каб ствараць прыгажосць. А для нас які падарунак: поўная зала людзей! Вярэйкаўцы ведалі пра наш прыезд. Кіраўнік гаспадаркі “Ваўкавыскае” С. Н. Сідаровіч, старшыня Вярэйкаўскага сельвыканкама А. М. Стасюкевіч і Дзмітры Зязюля расказалі пра новаўвядзенні ў аграгарадку. А потым мы паказвалі ўсю сваю праграму, якую старанна рыхтавалі. Канцэрт усім вельмі спадабаўся, апладзіравалі стоячы. Дарылі букеты. Пакармілі смачным абедам, ды яшчэ цэлы кошык марожанага з сабою далі. Урэшце адпусцілі з сяброўскіх абдымкаў, і аўтобус павёз гурты ў санаторый “Пралеска”. Там сустракалі артыстаў нашы даўнія сябры: галоўурач В. І. Кухарчык, яго намесніца Г. Р . Найдзюк. Колькі ж падзячных слоў мы пачулі пасля канцэрта! Гледачам спадабаліся песні ў выкананні Веранікі Нікулінай, Аліны Паўлавай, Яны Звяздзілінай, Сафіі Дуюн, Вольгі Мачалавай. Я спявала новыя песні, а “Ой, бабы, бабы” выканалі па просьбе гледачоў з Верай Скібінскай.

Ну ўмеюць у Беларусі шанаваць мастацтва! На ўсіх трох канцэртах апладзіравалі нам стоячы. Шмат добрых слоў пачулі: і пра рэпертуар, і пра таленавітую моладзь. Танцоркі з “Лицея”, і сапраўды, нібы лёталі над сцэнай. На наступны год, дарэчы, Міхаіл Сіцько, пэўна, бачачы такія таленты, запрасіў нас у моладзевы летнік: на два тыдні! Так што мы яшчэ сустрэнемся.

З Ваўкавыска “Лицей” праводзілі ў Тальяці, а “Купалінка” скіравалася ў Мінск. Там, як і планавалі, сустрэліся з дырэктарам Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Міхаілам Рыбаковым. Ён падарыў ноты, сувеніры, кнігі, сцяжкі, беларускі флаг — шмат усяго для нас каштоўнага. Наведалі Музей Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальную бібліятэку з яе агляднай пляцоўкай, Музей Уладзіміра Мулявіна. Сустракаліся з паэтам Кастусём Цыбульскім, з кіраўніком ансамбля са Смалявіч “Пліса”. Яшчэ проста гулялі па горадзе, любаваліся прыгажосцю сталіцы. З намі былі яшчэ і педагогі-парнёры з мастацкіх школ Тальяці: Дзіцячай музычнай імя Балакірава і спецыялізаванай 46-й. Пры падтрымцы суполкі “Нёман” яны наладжваюць кантакты з Беларуссю, плануюць стварыць куткі, музеі, прысвечаныя беларускай гісторыі, культуры. А можа і завязаць сяброўства з падобнымі навучальнымі ўстановамі Мінска.

І яшчэ прыемная навіна: я купіла цымбалы! Спачатку асвою сама, а потым, можа, навучу граць і ўнучку Машаньку. Яна сёлета паступіла ў музычную школу. Трэба ж рыхтаваць змену…

Ад імя ўсяго тальяцінскага творчага дэсанта кажу яшчэ раз: з юбілеем цябе, наш родны Ваўкавыск! І вялікі дзякуй усім, хто дапамог ажыццявіць незабыўную паездку, хто душэўна прымаў нас у Ваўкавыску, Ваўкавыскім раёне і ў Мінску.

**Людміла Дзёміна, кіраўніца суполкі “Нёман”, г. Тальяці**

ЯК СПРАВЫ, ДЫЯСПАРА?

# Цёплыя словы за добрае свята

**У латышскім горадзе Дагда прайшоў міжнародны фестываль беларускай песні і танца “ФЭСТ”**

Прыгожае свята арганізавала Беларускае таварыства “Вербіца”, якім кіруе Таццяна Гогалінская, пры падтрымцы думы Дагдскага краю. Свята і пачалося з канцэрта ля будынка думы: песні звінелі ў цэнтры горада. А другі канцэрт быў на тэрыторыі сацыяльнага цэнтра. Там выступілі ўсе гурты, што сабраліся на фэст. Цёпла іх сустракалі людзі з абмежаванымі магчымасцямі, ветэраны, працаўнікі цэнтра.

Пасля перапынку фестывальнае шэсце рушыла да Народнага дома ў гарадскі парк. Там сустракалі ўсіх з хлебам-соллю. Адкрывалі свята на паркавай эстрадзе старшыня Дагдскай думы С. Вішкурэ, консул Беларусі ў Даўгаўпілсе Юрый Давыдоўскі, старшыня Беларускага таварыства “Прамень” з Рыгі Алёна Лазарава. Песняю “Гэта Беларусь мая” пачала канцэрт Ларыса Тукіш, салістка і кіраўніца мясцовага гурта “Вярба”. Потым далучыўся і ансамбль: гучалі песні на словы Станіслава Валодзькі. Ларыса яшчэ вельмі кранальна спявала песню “Рушнік”.

Далей у канцэрце з’явіўся... добры хлопец Янка. Вядучая Е. Пабяржына нагадала: у Латвіі 23-24 чэрвеня святкавалі Ліга, з кастрамі, вянкамі. А беларусы Латвіі святкуюць сваё свята — Купалле. Вось і Янка з Купалінкаю збіраліся пайсці шукаць сваё шчасце, папараць-кветку. Ды хлопец пакуль не можа знайсці сваю каханую. Маці дае сыну чароўную стралу: можа яна даляціць да прыгажуні? Страла трапіла спачатку ў Рэзэкне, потым — у Прэйлі, а яшчэ — у Даўгаўпілс... І шторазу песнямі адгукаліся гурты беларускіх таварыстваў з тых месцаў! Песні, здавалася, ляцяць над усім Дагдскім краем. Апладысментамі ўзнагароджвалі гледачы і салістаў Паўла Прозара (Даўгаўпілс), Людмілу Сінкевіч (Рыга), Ларысу Тукіш (Дагда). Эх, многа было прыгожых дзяўчат, ды сумуе Янка: няма яго любай... А страла даляцела аж да Рыгі, у гурт “Надзея”. Прыгожыя, галасістыя спявачкі, а не кранулі хлапечае сэрца. Шукае далей. Суседзі са Сварыней хацелі развесяліць сваімі танцамі і музыкай — дзе там... Упрыгожыла канцэрт яшчэ дагдзінская група “Oluteni”, якой кіруе Інта Вілюма: гучалі і латгальская, і беларуская народныя песні.



Павел Прозар з Даўгаўпілса



Ларыса Тукіш з Дагды

Прыехалі на фэст і прыгожа спявалі беларусы з Эстоніі (г. Маарду, Беларускае таварыства “Ялінка”) — гэта ансамбль “Купава”, ім кіруе Алёна Калягіна. Цёпла сустрэў фэст і артыстаў з Браслаўскага раёна: народны фальклорны гурт “Вярба”, якім кіруе С. Гламбоцкі, сабраў таленты ў Дрысвяцкім Доме культуры. “Хлеба, солі, шчасця, долі і ўсяго даволі!” — віталі публіку госці з Беларусі. А што ж Янка? Толькі як заспяваў ансамбль “Аколіца”, якім кіруе Т. Старавойтава, убачыў ён сваю адзіную ды моцна абняў: каб навечна з’ядналіся два сэрцы. Так што не трэба, хлопцы і дзяўчаты, шукаць шчасця далёка: яно заўжды побач ідзе, трэба толькі ўмець убачыць... Тым, пад прыгожую музыку, і завяршаўся наш фэст. Усе гурты выйшлі на сцэну, і паэт, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Станіслаў Валодзька шчыра дзякаваў гаспадарам за прыгожы, добра арганізаваны фэст. Потым старшыня думы С. Вішкурэ дзякавала ўдзельнікам, уручала граматы. Цёплыя словы гучалі і ў адрас Таццяны Гогалінскай — яна ж і падала ідэю фэсту, і вельмі шмат зрабіла, каб ён адбыўся.

На заканчэнне мы разам спявалі вядомую ўсім беларусам песню “Туляць, дык гуляць!” — і толькі як заканчвалі ўжо, то пачалі падаць з неба кроплі дажджу: нібы чакалі, каб не сапсаваць нашае свята!

**Зофія Іоніна, член таварыства “Вербіца”, Дагдскі край, Латвія**

ТВОРЧАСЦЬ

# Акцёры спяваюць пра незабыўнае

**У Купалаўскім тэатры паставілі спектакль-канцэрт “Другая сусветная”**

Першыя паказы прайшлі, калі адзначалася 70-годдзе Вялікай Перамогі. Пабудавана дзея паводле песняў барда Марка Мермана. Многія тэатральныя калектывы рабілі пастаноўкі, канцэрты да юбілею. А ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы, запэўніў мастацкі кіраўнік Мікалай Пінігін, спектакль і застанецца ў рэпертуары. Ён расказаў, што бард — яго даўні сябар, які нарадзіўся ў Мінску, вучыўся на філфаку БДУ. Хлопца вабіла сцэна, ён іграў у студэнцкім тэатры — там яны і пазнаёміліся. Марк ужо тады пісаў цудоўныя песні, якія спявалі Тамара Гвердцытэлі, Лайма Вайкуле. Апошнія гадоў дваццаць бард жыве ў Амерыцы, але творчыя кантакты з Мінскам не парываюцца. А галоўная тэма яго песень — Другая сусветная вайна.

У спектаклі — 18 песень. Яны — пра людзей на вайне і пра той страшны час. Песні гучаць у суправаджэнні аркестра тэатра. Спяваюць іх вядомыя артысты тэатра, а ў прэм’ерных паказах удзельнічаў і сам аўтар.

**ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ**

# Аб чым маўчаць камяні

(Заканчэнне. Пач. на стар. 1)

Каб зразумець помнікі мінулага, не абысціся без паглыблення ў гісторыю. Згадаем Люблінскую унію. Яна, як вядома, у 1569-м запачаткавала новы віток ва ўзаемадачыненнях краіны нашых продкаў Вялікага Княства Літоўскага з Польшчай ды гучна абвясціла пра стварэнне новай канфедэратыўнай дзяржавы на мапах свету: Рэчы Паспалітай, Рэспублікі Абодвух Народаў. А да таго часу, сведчаць гісторыкі і дакументы, паміж яе часткамі рэдка была згода. Ды і самую Унію ліцвіны разглядалі як вымушанае “зло”. Трэба ж было шукаць выйсце: спустошаныя ўсходнім суседам землі ВКЛ сам-насам не вытрымалі б доўга. Але замест “братняй дапамогі” заходні сусед глыбока “запусціў руку” ў ВКЛ і, дзякуючы “маніпуляцыям” з грамадскай думкай, адняў адным махам палову тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Менавіта тады Польшча прырасла Падляшшам і Руссю-Украінай (раней яна была ў складзе ВКЛ). Гучалі сярод палякаў і такія думкі: сілаю зброі, пакуль сусед аслаблены, падпарадкаваць і астатнюю частку, уласна Вялікае Княства Літоўскае і Жамойцкае. Ды ліцвінам удалося супыніць гэты “кідок на ўсход”. Ад таго часу, сведчаць розныя крыніцы, непрыязнь да заходніх суседзяў-“дабрадзеяў” назаўсёды пасялілася ў ліцвінскіх маёнтках.

І ўсё ж ВКЛ пасля Уніі не стала звычайнай правінцыяй Польшчы. (Як не страціла незалежнасць Беларусь у новы час, калі ўтварыўся 20 гадоў таму Саюз Беларусі і Расіі!) А менавіта ж гэтак, прынікаючы годнасць продкаў нашых, часцей трактуюць нашу тагачасную гісторыю суседзі: як з заходу, так і з усходу. Мяркуйце самі: ужо праз 9 гадоў Статутам 1588 года Леў Сапега агучыў забарону іншаземцам (у тым ліку і палякам!) набываць зямлю ў ВКЛ і праз тое прасоўвацца на дзяржпасады. Былі, безумоўна, выпадкі, калі правіла парушалася. Аднак ніякіх хваляў “асаднікаў” тады не было, а тыя людзі, што прыходзілі — ішлі ж сюды немцы, італійцы, шатландцы, палякі... — даволі хутка асіміляваліся на зацятых ліцвінаў. Сталі, можна сказаць, патрыётамі гэтай зямлі. І, безумоўна, увесь час палітычная эліта ВКЛ марыла пра вяртанне незалежнасці. Прыгадаем хаця б Кейданскую унію 1655 года: тады ВКЛ разарвала унію з Польшчай, і тагачасныя нашы жамойты нават марылі пра аддзяленне ад ВКЛ. Карацей, дух ліцвінскай незалежнасці заставаўся нескароным аж да канца існавання Рэспублікі Двух Народаў, ды і пазней.



**Так адлюстраваў перамогу войскаў караля Яна Сабескага пад Венай у 1683 годзе мастак Ян Матэйка**



**Застаецца загадкай: хто зрабіў гэты мемарыял?**

Падыдзем да Вены... Польскія даследчыкі, спрабуючы разабрацца, чаму выдатнае, моцнае, загартаванае ў шматлікіх войнах з туркамі ды маскавітамі войска ВКЛ так і не паспела на поле бою пад Венай, вымушаны прызнаюць факт: вышэйшыя магнацкія колы ВКЛ з даўніх часоў мелі выразныя “сепаратысцкія” настроі. Які цынізм! Тое, што з нашага боку было барацьбою за Незалежнасць — палякі называюць сепаратызмам... Спачатку ў той высакароднай справе рэй вялі Радзівілы, потым — Пацы, за імі — Сапегі. Напяпярэдадні вайны з туркамі краінай фактычна кіравалі род Пацаў. Але калі ў 1682-м памёр Міхал Пац (у гусарскай харугве якога, дарэчы, служыў Марцыян, прадзед Тадэвуша Рэйтана), то яго булаву — Вялікага гетмана Літоўскага — кароль Рэспублікі перадаў Казіміру Сапегу. Спадзеў быў такі: “сепаратысція” мары той суцішыць і сам стане паслухмянаю лялькаю ў руках караля. Так не стала! А стала яшчэ горш, з пункту гледжання палякаў, што паказаў сойм 1683 года, які мусіў узгадніць пытанні вайсковага характару. Да таго ж ліцвіны ў тыя часы былі, можна казаць, выразна прафранцузскай скіраванасці: у той час як палякі падтрымлівалі Габсбургаў, што таксама не спрыяла паяднанню думак у розных частках Рэспублікі.

І вось — 1683 год, вайна з туркамі. Папярэдні расклад сіл у Рэспубліцы Двух Народаў мы збольшага апісалі. Вялікалітоўскае войска тады выпраўлялася ў шлях. Было ў ім, паводле гістырычных звестак, 10000 вояроў: 1000 гусар, 3000 пяцігорцаў, 1500 лёгкіх вершнікаў у татарскіх і казацкіх харугвах, 1500 драгунаў, 4 400 драбаў узору “нямецкага” і 600 “вянгерскага” ды ледзь не такі ж па колькасці абоз іншоў няспешна, “па гарах, у абход магістральных шляхоў”.

Рушыла да Вены і польскае войска: 26 000 чалавек. Больш за палову там было русінска-украінскай шляхты і казакоў, якім у Вене, дарэчы, нядаўна пастаўлены помнік. Кароль Ян ІІІ Сабескі, збіраючы войска пад Кракавам, увесь час атрымліваў сумныя весткі з Аўстрыі: Вена, у якой каля 15 тысяч абаронцаў, абкладзена туркамі, якіх у 20 разоў болей, трымаецца, але “надоўга трываласці не хопіць”. Таму, не дачакаўшыся ліцвінаў, 29 ліпеня польскія войскі рушылі ў паход. Вялікалітоўскія тады падыходзілі да Варшавы. А калі войскі хрысціянскай кааліцыі Аўстрыі, Нямеччыны і Польшчы 12 верасня разбілі турэцкае войска Кара-Мустафы ў працяглай і крывапралітнай сечы, нашы толькі падцягваліся да Кракава. Дзе і былі заспеты ганцом пераможцаў, з загадам скіравацца ў Венгрыю, дзе атабарыўся лютэранін князь Цёкёле, хаўруснік Асманскай імперыі ды заяты вораг каталікоў Габсбургаў і Яна ІІІ Сабескага.



**Геолаг з Мінска Уладзімір Шымановіч ля камянёў**

Важны момант: дзесяцітысячнае войска ВКЛ складалася з прадстаўнікоў, бадай, усіх вядомых шляхецкіх і магнацкіх родаў. Так што калі б хоць якая частка яго дайшла да Вены, гэта было б вядома і нам, і нашчадкам вояроў. Але ж нам такіх сведчанняў не сустрэлася. А пра далейшы пераможны шлях літоўскага войска “сведкі падзей” шмат напісалі ў судовых кнігах. Скардзіліся спачатку палякі, праз землі якіх ішло войска, потым наракалі і венгры. Але ж вайна ёсць вайна: паводзіны жаўнераў падобныя, пад якімі б яны харугвамі ні ішлі. Ліцвіны, і гэта галоўнае, добра біліся ў чужым краі, бо ад гэтага залежала іх слава і вяртанне дамоў. Дбалі і пра трафеі. Пры тым нашы гетманы раз-пораз выказвалі непадпарадкаванне загадам караля, якія прыніжалі гонар ВКЛ. Аднойчы, у снегавую завіруху, Ян ІІІ вырашыў паказаць сваім габсбургскім прыяцелям моцнае і свежае войска Літвы. Шэсць гадзін чакала высокае начальства “без агня і даху”, а ліцвіны не з'явіліся. Потым казалі: пахолкі раз'ехаліся па акрузе шукаць сена, а ў малой лічбе з'яўляцца “дзе, негожа”... Неўзабаве войскі разышліся “на зімовыя кватэры”.

Удаўнія часы “вера” была нормаю нават сярод вояроў, якія, з лёгкасцю парушаючы запаветы Божыя, з такой жа лёгкасцю потым у тым шчыра каяліся. І няма чаго дзівіцца, што нашы вояры вывезлі з тэрыторыі баявых дзеянняў такія-сякія трафеі, сярод якіх і абразы Дзевы Марыі з сынам. Мы маем звесткі пра два такія. Адзін — цудатворны абраз з касцёла мястэчка Арава. Казімір Сапега падараваў яго віленскаму Брацтву Дзевы Марыі. Другі абраз “пэўны шляхціц” падараваў касцёлу ў Васілішках, дзе ён знаходзіцца, пэўна, і цяпер. Не адставалі ў тым ад ліцвінаў, а можа і падаўшы ім прыклад, і палякі. Вядома пра абраз Девы Марыі Ларэтанскай, які Гетман каронны Ябланоўскі “адшукаў” блізу Вены ў руінах палаца і падараваў Яну ІІІ Сабескаму. Пазней гэты абраз, разам з усімі трафеямі 1683 года Сабескага, пярэйдзе Радзівілам. Польскія даследчыкі згадваюць і пра выявы вояроў з Гародні, удзельнікаў сечы, у касцёле бернардынаў. Але ці гэта вояры той выправы, ці то проста выявы 12 дзеячаў ВКЛ, якія разглядаюць 12 апосталаў, што намаляваны на супрацьлеглым баку сцяны ў XVIII стагоддзі, сказаць цяжка.

А з нясвіжскімі трафеямі звязаны такі факт. У 100-годдзе Венскай сечы наш апошні кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі даў загад: святкаваць перамогу ва ўсіх дварах і падворках краіны. І нават выдзяліў на тое “аж 100 000 злотых”, што выклікала насмешкі над яго “шчодрасцю”. Радзівілы ж паставіліся да справы больш адказна. Не маглі яны даць каралю пераўзысці сябе ў шчодрасці і размаху святкавання. Усе трафеі, іншыя памяткі па Сабескіх, з якімі парадніўся род Радзівілаў — шатры, узбраенне, бунчукі... — паказвалі грамадскасці ў Нясвіжы. Рэчам нават у тыя часы “не было цаны”, як пісаў “першы паэт Літвы” Уладзіслаў Сыракомля, нашчадак Казіміра-Уладзіслава Кандратовіча, удзельніка выправы 1683 года. Цяпер усё тое захоўваецца ў Нацыянальным музеі Варшавы, куды патрапіла ў XX стагоддзі.

А Патапавіцкія камяні, безумоўна, маюць дачыненне да кампаніі 1683 года! Калі не да бітвы пад Венай, то да вайны ў гарах Венгрыі, якая выбіла з шэрагаў блізу 1000 вояроў ВКЛ. Валуны маглі быць усталяваныя прадстаўнікамі навагрудскай шляхты ў гонар вяртання продкаў з вайны, у памяць пра загінулых продкаў ці сваякоў. Пэўна, валуны ўстанавілі, зрабілі на іх надпісы пад час святкавання “100-годдзя перамогі”: у 1783-м. Дарэчы, некаторыя камяні яшчэ засыпаны зямлёй, месца патрабуе археалагічнага даследавання.

Патапавіцкі комплекс — знакавая адметнасць Ляхавіччыны, прычым разам з Грушаўкай: яна там непадалёку. Першым уладальнікам Грушаўкі, з роду Рэйтанаў, сапраўды быў удзельнік той вайны, Міхал Казімір Рэйтан, дзед Тадэвуша Рэйтана. То ці не з ініцыятывы яго нашчадкаў і рабіўся мемарыял?

**Зьміцер Юркевіч,**
**арт-суполка імя Тадэвуша Рэйтана**

ІМІДЖ КРАІНЫ

# Сувенір на ўспамін

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

**— Вашаму кааператыву ужо чвэрць стагоддзя! У яго, я даведалася, уваходзяць 500 народных майстроў і мастакоў з усёй Беларусі. Як вам удалося аб'яднаць майстроў розных напрамкаў, з розным узроўнем майстэрства, па сутнасці, пад адным дахам?**

— Працэс "збірання" быў досыць складаным і доўгім. Майстроў збіралі па ўсёй Беларусі. Ездзілі па мястэчках і вёсках: да каго з цукеркамі, да каго і з бутэлечкай... Як правіла, гэта былі пажылыя людзі, якія пабачылі жыццё ды не кожнаму адкрыюць сакрэты майстэрства. Спачатку раскажуць пра сваё здароўе, пра дзяцей, потым пра ўнукаў і толькі потым, можа, могуць паказаць, як, напрыклад, плятуць саломку. Сёння кааператыў аб'ядноўвае 500 майстроў. Самых розных спецыяльнасцяў. Але мы іх усіх называем людзьмі, якіх пацалаваў Бог. Залаты фонд краіны! Яны робяць унікальныя рэчы, якія "дадуць фору" любой рэчы фабрычнай. Кожная — непаўторная, напоўнена не толькі любоўю, але і асаблівай нацыянальнай энергетыкай. Яны ствараюць такія шэдэўры, якія становяцца візітнай карткай краіны.

**— Дык які ж самы прызнаны сувенір з Беларусі? Што трэба везці ад нас на памяць? Можа, ёсць рэйтынг самых папулярных сярод замежнікаў сувеніраў?**

— Рэйтынг найпапулярных сувеніраў адкрываюць пано гарадоў, далей — апетытныя рэцэпты беларускай кухні, выкананыя на лёне, і яшчэ керамічныя званочкі, драўляныя фальклорныя персанажы. Параненейшаму папулярныя вырабы з лёну: льняная вопратка, пасцельная і сталовая бялізна. І лялькі! Дарэчы, да ўвагі калекцыянераў: лялька ўжо даўно стала сувенірам сусветнага значэння. У кожнай краіне яна свая: венгерскую робяць з катаха кукурузы, украінскую (а часам і беларускую... — **Рэд.**) ляльку-мотанку не шыюць і не вяжуць, а "матаюць", скручваюць. Беларуская лялька — гэта льняная лялька, якая абавязкова шыецца з неадбеленага лёну, ёсць яшчэ саламяная лялька. І любая з іх робіцца дзеля гарманізацыі стасункаў, прыцягнення дабрабыту, набліжэння і паскарэння пэўных падзей і як абярэг. Акрамя саламяных лялек, нашы майстры з саломы робяць скульптуры, сухарніцы, шкатулкі. Заўважу: такой тэхнікі пляцення аб'ёмнай саломкі, як у нас, няма больш нідзе ў свеце.

**— Я чула трохі і пра Сожскую скань...**

— Так, ёсць у нас Сожская або Гомельская скань — і такога промысла больш анідзе няма. Раней была вядомая расійская скань або філігрань: калі з тоненькага срэбнага, залатога або меднага дроту скручваюцца розныя ўзоры. Нашы майстры пайшлі далей. З больш непаслухмянага матэрыялу — са звычайнай драўлянай стружкі-габлюшкі навучыліся рабіць сапраўдныя шэдэўры. А пачыналася як? Гадоў 20 таму вядомы майстар Уладзімір Цыкуноў, цяпер ужо нябожчык, у музеі на акладзе старадаўняга абраза XV стагоддзя заўважыў маленькія драўляныя завіточкі. Не мог зразумець, што гэта, а калі зразумеў, то вельмі здзівіўся. Аказалася: найтанчэйшая драўляная габлюшка, толькі ж выкладзеная асаблівым спосабам. Пазней ён прыдумаў станочак, які можа здымаць з драўляных палачак найтонкія стужачкі-габлюшкі, і ўжо з дапамогай пінцэта выкладваў узоры. Сёння такіх майстроў па ўсёй Беларусі не больш за 10 чалавек. Яны робяць унікальныя рэчы: аклады ікон, шкатулкі, крыжы, гербы розных гарадоў Беларусі ды многае іншае. Кожная іх праца — сапраўдны драўняны эксклюзіў, бо паўтарыць адну і тую ж форму проста немагчыма. Сярод уладальнікаў такіх работ нямала людзей вядомых: Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл, Папа Рымскі, англійская каралева, Уладзімір Пуцін, Дзмітрый Мядзведзеў...



У мінскіх крамах ёсць сувеніры на розныя густы



Беларускія майстры ведаюць сакрэты пляцення з саломкі

**— У розных краінах — розныя і густы? Як вы лічыце?**

— Калі казаць пра густы замежнікаў, то і тут можна выявіць нейкую заканамернасць. Італьянцам, скажам, вельмі падабаюцца нашы вырабы з лёну. Турысты з Кітая імкнуцца набыць драўляныя разьбяныя скульптуры. Расіяне вельмі цэняць наш керамічны посуд. Часта ў нашу галерэю заходзяць і беларусы, якія жывуць за мяжой. Жадаючы павезці "кавалачак" сваёй Радзімы, яны з задавальненнем купляюць краязнаўчую літаратуру з фотаздымкамі.

**— Дзе ў Мінску вы параіце купляць сапраўдныя беларускія сувеніры?**

— Шмат такіх месцаў... Падаецца мне, найбольш багаты выбар эксклюзіўных сувеніраў — у нашых галерэях рамёстваў "Славутасць" і "Славутыя майстры" ў Траецкім прадмесці. Ёсць яшчэ "Галерэя нацыянальнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва", ёсць шмат сувенірных крам ля Мінскай ратушы.

Вось такая цікавая атрымалася ў нас размова з Аленай Спірыдонавай. Мяркую, яна дапаможа некаму "на ўскрайку лета" правільна з'арыентавацца ў беларускім сувенірным моры. Заканчваецца пара адпачынкаў, падарожжаў — трэба ж пакінуць пра іх добры ўспамін. Зрэшты, увесь год, мы заўважылі, наведваюцца на Бацькаўшчыну нашы землякі-супляменнікі з замежжа. Майце на ўвазе: з Беларусі можна прывезці такі сувенір, якога анідзе ў свеце больш няма! То можа гэта будзе нешта, створанае таленавітымі беларускімі майстрамі, напоўненае іх дабрынёй і прыгожаю сілай?

**Гутарыла Іна Ганчаровіч**

ВОЛЬНАЯ ЧАСІНА

# Калейдаскоп майстэрства

**Ніна Шпакоўская**

**Незвычайныя танцы ў Клубе гістарычнай рэканструкцыі "Люцэрн" вывучаюць па старажытных фрэсках**

Цікавасць да мінулага — адметная рыса людзей культурных і адукаваных. Пра тое я з радасцю згадвала ўвесну, калі трапіла на даволі незвычайную імпрэзу ў Мінскім дзяржаўным палацы дзяцей і моладзі. Цэлы калейдаскоп сярэднявечных танцаў на тым карнавале пашчасціла пабачыць!

Проста дзіву даешся: і як гэта такая экзатычная культура, якая ўжо набывае ў мінскіх культурна-моладзевых колах сваіх прыхільнікаў, тут прыжылася? Старадаўнія мастацтвы Заходняй і Усходняй Еўропы зліліся ў маляўнічую рапсодыю на Фларэнцыйскім карнавале. Уяўляеце: Фларэнцыйскім! Традыцыйны баль сабраў такіх незвычайных асобаў: галантных рыцараў сярэдневякоўя, загадкавых какетак рэнесансу і нават вельмі эксцэнтрычных персанажаў з літаратурных твораў стылю фэнтэзі.

А што за танцы былі! Рытмічная гальярда змянялася строгай чорнай алемандай, шпаркі брануль — манерным друмулам Дракуле... Здаецца, я нічога не пераблытала? А ў перапынках паміж танцамі прысутныя спаборнічалі яшчэ і ў спрытнасці ў старадаўніх забавах. Вы бачылі такое: "кошка" з завязанымі вачамі лавіла "мышак" — а ў іх званочкі-бразготкі-бубенчыкі на нагах. А прывязаныя да спін сваіх "невідушчых" кавалераў дзяўчаты падказкамі пракладалі ім шлях праз перашкоды. Шоу яшчэ тое!

Незвычайныя па ўдзельнікі карнавала асвоілі на занятках у Клубе гістарычнай рэканструкцыі "Люцэрн" пры вышэйзгаданым Палацы. Па словах аднаго з кіраўнікоў клуба, Ірыны Салавей, больш за дваццаць гадоў аматары асвойваюць адноўленыя па запісах ці фрэсках старадаўнія танцы. Выхаванцы клуба па жаданні вывучаюць і майстэрства валодання мячом. Дарэчы,



НІНА ШПАКОЎСКАЯ

Удзельніца карнавалу

створаная на базе клуба зборная Беларусі па гістарычным сярэднявяковым бoі ўдзельнічае ў розных спаборніцтвах. І даволі паспяхова.

РОЗГАЛАС

# Добрым гасцям заўжды рады

**Нататкі наўздагон кангрэсу**

У канцы мая адбыўся VI Міжнародны кангрэс беларусістаў. Падзея асвятлялася рознымі СМІ. І штомесячнік "Беларус" змясціў артыкул Ганны Сурмач "Кангрэс Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў". Там гаворыцца, што пасяджэнні форума "наведалі даследчыкі з 14 краінаў", "зоркаю кангрэса" называецца японка з Цукубскага ўніверсітэта Сіёры Кіёсава. Далей названы адказныя асобы, якія выступілі з прывітаннямі. Здавалася б, усё правільна, але…

Далей — абзац, з якім я як адзін з сузаснавальнікаў МАБ і цяперашні яе ганаровы старшыня не магу пагадзіцца. Гэта беспадстаўныя папрокі ў адрас асацыяцыі і яе новага старшыні Аляксандра Сушы: "Сёлетні кангрэс, як выглядае, праходзіў пад патранатам дзяржаўных структураў. Абранне новым старшынём МАБ намесніка дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі ў сучаснай сітуацыі сведчыць пра тое, што дзяржава бярэ пад свой кантроль дзейнасць гэтага раней незалежнага аб'яднання. Доказам таму ёсць той факт, што на сёлетні кангрэс не былі запрошаныя знаныя беларусісты з Амэрыкі і Канады. Вядома, што ў гэтых краінах доўгі час дзейнічаюць Інстытуты беларускай навукі і мастацтва, якія шмат зрабілі ў галіне беларусістыкі ў замежжы. Аднак на гэтым кангрэсе іх прадстаўнікі сталіся непажаданымі".

Зробім удакладненні. Першае: "пад патранатам дзяржаўных структураў" МАБ была заўсёды, з часу арганізацыі. І я адразу ж пасля выбрання кіраўніком МАБ пастараўся ў адпаведнасці з заканадаўствам і нашым статутам, каб асацыяцыю зарэгістравалі ў Мінюсце. Ганна Сурмач тое добра ведае: яна тады кіравала "Бацькаўшчынай", нашы арганізацыі працавалі ў адным будынку па вул. Рэвалюцыйнай, 15.

Па-другое: ні на папярэдні, ні на шосты кангрэс МАБ ніхто нікога загадзя не запрашаў. Аргкамітэт абмеркаваў тэматыку форума, змясціў яе на старонках сайта, у рассылцы асацыяцыі. І толькі пасля прысланай нам канкрэтнай заяўкі з названай тэмай дасылалі запрашэнні. Так прыехалі, скажам, з Англіі прафесары Джым Дынглі і Арнольд Макмілін, а таксама немцы і палякі, японка Сіёры Кіёсава. Што да калег са ЗША і Канады, то мы маглі толькі патужыць, што іх няма. Па іх жа свабоднай волі... І навошта шукаць нейкае дзяржаўна-палітычнае умышанне там, дзе яго не было?!

Што да Аляксандра Сушы, то я толькі баюся, што ён адмовіцца ад грамадскага даручэння. Але ён даў згоду, і яго абралі аднагалосна. Веру: гэта толькі на карысць справе!

**P. S.** А за прысылку газеты Ганне Сурмач шчыра дзякую. Яе матэрыялы, асабліва гістарычнага характару, часта выкарыстоўваюцца (са спасылкамі) не толькі мной, але і маімі калегамі.

**Адам Мальдзіс, ганаровы старшыня Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў**

**Заснавальнік:** Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск
**Рэдактар** Віктар Міхайлавіч Харкоў
**Адрас рэдакцыі:** пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005
**Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61.** Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
**Бюро па рэкламе:** Тэл. +375 17 290 60 11
**Тэлефон рэдакцыі:** +375 17 288 17 82; факс: +375 17 290 68 31
**E—mail:** golas_radzimy@tut.by
**Аб'ём выдання:** 1 друк. арк.
**Час падпісання ў друк:** 20.10
**Тыраж:** 1920, **Заказ:** 1215
Выходзіць 1 раз на тыдзень
Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск
Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.

© "Голас Радзімы", 2015